

Фота Паўла Цыбіна

Уладальніца Гран-пры Таццяна Пенкрат.

# Цуды з паперы

На IV рэгіянальнае свята-конкурс выцінанкі «Папяровыя карункі» з'ехалася 38 майстроў з розных куточкаў Міншчыны.

Выцінанка, мастацтва выразання ўзораў з паперы, апошнім часам набывае ўсё большую папулярнасць. Святам паперы, нажніц і чалавечых рук назваў гэтае творчае спаборніцтва начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маладзечанскага райвыканкама Аляксандр Рамановіч. Першай часткай конкурсу стала выстаўка «хатніх калекцый» удзельнікаў, другая ж уяўляла сабою адкрытае спаборніцтва ў выкананні папярэдне прадуманага твора. Адметна, што фантазія ўдзельнікаў не абмяжоўвалася адно традыцыйнай выцінанкай.

Ацэньвала работы кампетэнтнае журы на чале з доктарам мастацтвазнаўства, прафесарам, старшынёй Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Яўгенам Сахутам. «Гэта не толькі конкурс, але і сустрэча з калегамі, новыя знаёмствы, абмен досведам», — падкрэсліў Яўген Міхайлавіч.

Між членаў журы — Лізавета Чырвонцава, загадчык аддзела дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. К. Агінскага, дачка пачынальніцы айчыннай школы выцінанкі Вікторыі Чырвонцавай. У канцы 1980-х Вікторыя Мікітаўна, якая з дзяцінства палюбіла мастацтва выразання з паперы, фактычна заклала дэкаратыўна-прыкладны кірунак у маладзечанскай мастацкай школе, пазней — у Маладзечанскім дзяржаўным музычным каледжы імя М. К. Агінскага. Сёння выцінанкай займаюцца сама Лізавета, яе сястра, іх дзеці. Л. Чырвонцава — выпускніца факультэта народных рамёстваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Гран-пры конкурсу атрымала прадстаўніца Чэрвеньскага раёна Таццяна Пенкрат. Самая сталая ўдзельніца «Папяровых карункаў» — жыхарка сталіцы Валянціна Слюнчанка, а самая юная — 6-гадовая Мілана Рэут з Валожынскага раёна. Дарэчы, яе маці, Наталля Рэут, таксама канкурсантка, прызнаная лаўрэатам у намінацыі «За лаканізм і выразнасць мастацкай мовы». Першае месца ў гэтай жа намінацыі дасталася Але Бажко з Маладзечаншчыны. З лепшай калекцыяй хатніх работ перамагла Ксенія Альфер з Вілейскага раёна, за высокае прафесійнае майстэрства і мастацкі густ дыпломам I ступені ўганаравана Вольга Сарока з Маладзечанскага раёна, а за творчае развіццё мастацкіх традыцый і адаптацыю выцінанкі да сучаснага асяродку — жыхарка Вілейшчыны Вольга Іваненка… Усяго пераможцы і лаўрэаты вылучаны ў больш як 10 намінацыях.

Паводле Я. Сахуты, любая традыцыя мае працяг тады, калі ёсць каму яе развіваць. І спаборніцтва сапраўды паказала: майстэрства выцінанкі ў нашай краіне жыве і ўдасканальваецца.

Яна ЯВІЧ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ